# ГІСТОРЫЯ ДРУКУ Ў ДАСЛЕДАВАННІ М. Я. ЦІКОЦКАГА

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле актуалізаваны тэарэтыка-метадалагічны падыход да гісторыі беларускай журналістыкі, абгрунтаваны ў даследаванні прафесара М. Я. Цікоцкага.

***Ключавыя словы:*** друк; беларуская журналістыка; гісторыя развіцця; даследаванне; падыход.

# THE HISTORY OF PRESS IN THE RESEARCH BY M. E. TIKOTSKY

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article actualizes the theoretical and methodological approach to the history of Belarusian journalism, justified in the research by Professor M. E. Tikotsky.

***Key words:*** press; Belarusian journalism; history of development; research; approach.

Прафесійная навуковая школа беларускай журналістыкі фарміравалася ў сярэдзіне XX ст. Працэс асэнсавання гісторыі айчыннага друку заканамерна супаў з пачаткам інтэнсіўнага развіцця журналісцкай адукацыі ў нашай краіне. Так, у канцы 1960-х гг. факультэт журналістыкі пачаў развівацца як самастойнае падраздзяленне БДУ. Менавіта ў гэты час і з'яўляюцца грунтоўныя працы па тэарэтычным асваенні вопыту журналісцкай дзейнасці. Першымі даследчыкамі гісторыі айчыннай журналістыкі сталі С. Х. Александровіч («Пуцявіны роднага слова: праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX –

пач. XX стагоддзя», 1971 г.), Р. В. Булацкі («Первые рабселькоры Белоруссии», 1969 г. і інш.), М. С. Зярніцкі («Газета “Звязда” ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі», 1957 г. і інш.), С. В. Марцэлеў («Печать Советской Белоруссии (исторический очерк)», 1967 г.). У наступныя дзесяцігоддзі айчынная навуковая школа гісторыі журналістыкі папоўнілася каштоўнымі даследаваннямі А. Г. Слукі («Комсомольская строка: проблемы идейно-политического воспитания в молодежной печати Белоруссии», 1984 г.), Р. В. Булацкага, І. І. Сачанкі, С. В. Говіна («Гісторыя беларускай журналістыкі», 1979 г.) і многімі іншымі працамі.

У шэрагу пачынальнікаў беларускай гістарычнай школы журналістыкі стаіць імя вядомага вучонага, даследчыка, заснавальніка айчыннай стылістыкі прафесара М. Я. Цікоцкага. Яго працы («Практычная стылістыка беларускай мовы», 1965 г.; «Стылістыка публіцыстычных жанраў», 1971 г.; «Сугучнасць слоў жывых. Нататкі па стылістыцы мастацкай літаратуры», 1981 г. і інш.) сёння сталі асновай для развіцця цэлага навуковага напрамку, які паспяхова развівае кафедра медыялінгвістыкі і рэдагавання. У той жа час нельга не адзначыць, што ў аснове лінгвістычных даследаванняў прафесара М. Я. Цікоцкага – каштоўны гістарычны матэрыял. Глыбокае і грунтоўнае валоданне гістарычнай інфармацыяй дазволіла аўтару стварыць каштоўныя навуковыя працы, запатрабаваныя сёння і ў медыявытворчасці.

Лепшыя дасягненні любой класічнай навукі грунтуюцца менавіта на гістарычным фундаменце, на глыбокім разуменні законаў узаемасувязей. Дзякуючы гэтаму ствараецца цэласнае разуменне заканамернасцей развіцця асобных яе напрамкаў. Так, невыпадкова шлях у вялікую навуку для прафесара М. Я. Цікоцкага пачынаўся з асэнсавання гістарычнага працэсу беларускай журналістыкі. Адной з самых значных яго прац стала даследаванне «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя» (Мінск, БДУ, 1960 г.). У той жа час гэта было першае навуковае асэнсаванне гісторыі беларускага друку XIX ст. У рабоце аўтарам быў прадстаўлены аналіз напрамкаў дзейнасці «Губернских ведомостей» як першых перыядычных выданняў на беларускай тэрыторыі. У наступных раздзелах мы можам назіраць даволі аб’ектыўную ацэнку падзей другой паловы XIX ст., у прыватнасці, звязаных з дзейнасцю К. Каліноўскага і выданнем газеты «Мужыцкая праўда». Сёння ні для каго не сакрэт, што менавіта гэты перыяд часта выкарыстоўваецца ў якасці аргумента ў шматлікіх

палітычных дыскусіях. Гісторыкі ў апошні час неаднойчы звярталіся да ацэнкі падзей, звязаных з паўстаннем 1863 г. Уважлівае знаёмства з матэрыялам, прадстаўленым у працы М. Я. Цікоцкага, паказвае нам, што грунтоўны падыход да вывучэння і асэнсавання гістарычных фактаў лагічна прыводзіць да іх аб’ектыўнай ацэнкі. І нават пэўныя ідэалагічныя ўстаноўкі савецкага часу, а потым і рознага кшталту пазнейшыя інтэрпрэтацыі не сумелі сказіць іх сутнасць. Чытаем у М. Я. Цікоцкага: «Супярэчлівасць грамадскай рэчаіснасці, у якой разгортвалася дзейнасць Каліноўскага, выклікала супярэчлівасць, непаслядоўнасць, а часам і сур’ёзныя памылкі ў яго поглядах і практычнай дзейнасці… «Мужыцкая праўда» дапускала памылку ў ацэнцы характару польскага паўстання 1863 г. Шляхецкае нацыянальна-вызваленчае паўстанне газета атаясамлівала з шырокім сялянскім паўстаннем на Беларусі» [1, с. 47].

Вельмі цікавым ў гэтай працы з’яўляецца раздзел, у якім прадстаўлены агляд публікацый беларускіх аўтараў у рускіх дэмакратычных выданнях другой пал. XIX ст. «Современник», «Колокол», «День» і інш., а таксама аналіз фактаў і падзей, звязаных з развіццём грамадскага руху, фарміраваннем друку. Гістарычны нарыс пра дзейнасць першай на тэрыторыі Беларусі прыватнай грамадска-літаратурнай газеты «Минский листок» да пачатку 2000-х гг. заставаўся, па сутнасці, адзіным даследаваннем дадзенага выдання.

Безумоўна, вывучэнне працэсу развіцця сродкаў масавай інфармацыі ў мінулым стагоддзі адбывалася ў адпаведнасці з ідэалагічнымі задачамі савецкай эпохі. У той жа час многія тэарэтычныя палажэнні, сфармуляваныя даследчыкамі, не толькі застаюцца актуальнымі, але і ў некаторай ступені набываюць новае значэнне. Так, у прадмове да вышэйназванай працы М. Я. Цікоцкі пазначае важнейшую задачу гістарычнай навукі – «абгрунтавання дыялектыка-матэрыялістычнага метаду ў высвятленні і ацэнцы канкрэтнага гістарычнага матэрыялу» [1, с. 4]. Далей аўтар падкрэслівае вельмі важную і на сёння акалічнасць: «Без вывучэння гістарычнага працэсу, у тым ліку і культурнага працэсу, ва ўсёй яго шматграннасці нельга скласці глыбокага, поўнага і правільнага ўяўлення аб ім. Без вывучэння і ведання ўсіх тэндэнцый развіцця на кожным гістарычным этапе, усіх складанасцей, супярэчнасцей, канфліктаў і барацьбы паміж процілеглымі тэндэнцыямі нельга зразумець, як і чаму перамаглі самыя перадавыя, прагрэсіўныя тэндэнцыі, як яны авалодвалі масамі і ўрэшце вызначылі паступальны

рух чалавецтва, яго культуры» [1, с. 5]. У сувязі з гэтым выклікае вялікую цікавасць для сучаснікаў трактоўка многіх гістарычных падзей і фактаў.

Глабалізацыйныя працэсы ва ўсіх сферах сучаснага жыцця, поўная трансфармацыя інфармацыйнай прасторы, мадэрнізацыя працэсу адукацыі абсалютна заканамерна прыводзяць да асэнсавання таго, што кардынальных змен патрабуюць многія аспекты як прафесійнай журналісцкай дзейнасці, так і навукова-тэарэтычнай. У той жа час мы назіраем, як страчваюцца вельмі значныя для грамадства каштоўнасці, першай з якіх з'яўляецца пераемнасць і глыбокае аб'ектыўнае асэнсаванне падзей і працэсаў мінулага.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Цікоцкі М. Я.* З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя. Мінск: БДУ. 1960. 128 с.